**З вопыту рэалізацыі праекта**
**«ШАГ» – «Школа актыўнага грамадзяніна»**
**у дзяржаўнай установе адукацыі**
**«Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа»**
**Брэсцкай вобласці**

**28.09.2023 –дзень інфармавання ў рамках рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта «ШАГ»**

**Тэма:** «Радзіма мая Беларусь у асобах. Ад вясёлых стартаў – да Алімпійскіх вяршыняў» (пра легенды і герояў спорту, развіццё індустрыі спорту і турызму)

**Мэта:** фарміраванне ў вучняў пачуцця гонару за сваю краіну, грамадзянскай ініцыятывы, садзейнічаць фарміраванню ў вучняў цікавасці да гісторыі малой Радзімы.

**Удзельнікі:** вучні VIII–XI классов ДУА «Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа».

28 верасня 2023 года ў ДУА «Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа» ў рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа актыўнага грамадзяніна» прайшла інфармацыйная гадзіна па тэме «Радзіма мая Беларусь у асобах. Ад вясёлых стартаў – да Алімпійскіх вяршыняў» (пра легенды і герояў спорту, развіццё індустрыі спорту і турызму).



На першым этапе класны кіраўнік 11 класа Савончык Уладзімір Аляксандравіч правёў з навучэнцамі інтэрактыўную віктарыну «Мы даведаемся» з мэтай актуалізацыі ведаў аб развіцці спорту і турызму ў Рэспубліцы Беларусь.



У ходзе рэалізацыі кроку «Мы разважаем» Уладзімір Аляксандравіч распавёў аб выпускніках нашай школы, вядомых на ўсю краіну сваімі поспехамі па біятлоне. Імёны Уладзіслава Гаўдзіса і Дзмітрыя Сяргейчыка гучаць ганарова ў нашай школе і пасля іх паступлення ў іншыя ўстановы адукацыі. Рабяты заваявалі званне «Майстар спорту» і займаюць прызавыя месцы на рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах.

Класны кіраўнік адзначыў і тых зорачак, якія запальваюцца ў нашай школе. Сяргейчык Паліна у 2022 годзе прадэманстравала выдатны вынік на рэспубліканскіх спаборніцтвах «Снежны снайпер» і заняла 3 месца.



Ганарова тое, што у абласным этапе рэспубліканскіх спаборніцтваў у 2023 годзе нашы вучні заваявалі 9 медалёў, тым самым вывелі каманду Ганцавіцкага раёна ў абсалютныя пераможджцы. Два браты Занька Аляксандр і Занька Ілья у мінулым навучальным годзе сталі пераможцамі рэспубліканскіх спаборніцтваў па шматборью «Здароўе», дарэчы Сяргейчык Паліна таксама стала пераможцай у гэтых спаборніцтвах. Ілья прадставіў слайдшоў, якое дэманструе развіццё спорту ў яго ўласнай сям'і (https://disk.yandex.ru/i/41Yzq3b0FoVt6Q ). Нельга не адзначыць вялікі ўклад у развіццё спорту ў нашай установе адукацыі былога настаўніка фізічнай культуры і здароўя Уладзіміра Аляксандравіча Жалезнага.

У ходзе рэалізацыі кроку 3 «Мы дзейнічаем» Уладзімір Аляксандравіч падвёў вынікі, адзначыў, што спартыўныя дасягненні нашых юных спартсменаў на раённых, абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах дазволілі гучна заявіць аб сабе і паказаць прыклад моладзі.

*Курылік А.А., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці*
*ДУА «Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа»*